Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.
№ 42 (111)
СЕРАДА 21 ЛЮТАГА 1940 г.
Цана 10 капеек

Абвяржэнне ТАСС

1) Італьянскае агенцтва Стэфані распаўсюджвае з Стамбула паведамленне, нібы „адзін совецкі атрад перайшоў турэцкую граніцу на Каўказе“, што „турэцкімі ўладамі быў пасланы турэцкі атрад для высвятлення прычын гэтага пераходу“, што пры гэтым „бою не было“.

ТАСС упаўнаважан заявіць, што ўсё гэта паведамленне агенцтва Стэфані прадстаўляе плод хворай фантазіі яго аўтараў.

2) Бельгійская газета „Лібр Бэльжык“ публікуе паведамленне карэспандэнта „Юнайтэд прэс“, у якім гаворыцца, нібы „рускія ўзмоцнена распрацоўваюць у Фінляндыі нікелевыя руднікі ў раёне Лалойкі“, што „вялікая колькасць рабочых занята на пабудове шахт“ і г.д.

ТАСС упаўнаважан паведаміць, што гэтае паведамленне „Юнайтэд прэс“ ні ў якой меры не адпавядае сапраўднасці.

За рашучы паварот у загатоўцы і вывазцы лесаматэрыялаў

Пытанні загатоўкі і дастаўкі лесу маюць выключнае значэнне ва ўмовах Беластоцкай області. Ад вырашэння гэтага пытання залежыць не толькі нармальная работа лесапільных і фанерных заводаў, але і выкананне плана ўсёй прамысловасці області, якая працуе цалкам на мясцовым паліве. Ад гэтага залежыць і забеспячэнне дрывамі працоўных гарадоў.

Між тым, гэты важнейшы ўчастак народнай гаспадаркі ў нашай області недапушчальна адстае, зрываючы работу не толькі дрэваапрацоўчай, але і тэкстыльнай прамысловасці. Гартоп Беластока, які па плану павінен быў атрымаць на першы квартал 1940 года 40 тысяч кубаметраў дроў, атрымаў да 16 лютага ўсяго толькі 11 тысяч кубаметраў.

Лесазагатоўчы трэст, прыступіўшы да работы, не клапаціўся аб планавай сістэматычнай загатоўцы лесаматэрыялу. Лес і да сёнешняга дня загатаўляецца зусім нездавальняюча. На 10 лютага квартальны план выканан усяго толькі на 18 процантаў.

Такое-ж становішча з дастаўкай лесу гужавым транспартам да чыгункі. Дастаткова сказаць, што ў Мастах ляжыць 16.000 кубаметраў сыравіны для фанерных заводаў літаральна на адлегласці 500 метраў ад станцыі і ні леспрамгас, ні фанерны трэст не маглі арганізаваць падвозку яго да чыгункі. У выніку беластоцкі фанерны завод не выканаў план за студзень месяц.

Мы ўжо ўказвалі на недапушчальныя метады работы лесазагатоўчага трэста і лесазбыту, на засмечанасць іх апаратаў класава-варожымі элементамі, на непаваротлівасць іх кіруючых работнікаў, на іх адарванасць ад месц, на беспарадак у радзе леспрамгасаў, асабліва ў Азёрах. Але ў гэтым кірунку мала чаго змянілася. Не палепшылася яшчэ і справа аховы лясоў. Усё яшчэ лес, загатоўлены вечарам, „знікае“ к раніцы і прадаецца потым гандлярамі і кулакамі па спекулятыўных цэнах на рынку.

Паспяховае выкананне плана загатовак і вывазак лесаматэрыялаў у значнай ступені залежыць ад шырока разгорнутай масава-палітычнай работы сярод лесарубаў і возчыкаў. Аднак, трэба з усёй рашучасцю сказаць, што ніякай работы сярод лесарубаў і возчыкаў не праводзіцца. Кіруючыя работнікі абкома саюза лясной прамысловасці і оргбюро профсаюзаў яшчэ „не знайшлі часу“ выехаць на месца і арганізаваць профсаюзы лесарубаў, павесці сярод іх шырокую большэвіцкую растлумачальную работу. Яны не паклапаціліся аб тым, каб лесарубам растлумачыць новыя расцэнкі, каб укараніць сярод іх метады соцыялістычнага спаборніцтва і навучыць іх следаваць прыкладу выдатнага стаханаўца лесаруба Гоціна, вядомага сваімі вытворчымі подзвігамі і высокімі заработкамі.

Не лепш абстаіць справа з масавай работай сярод сялян-возчыкаў. Асабліва слаба работа сярод возчыкаў у Заблудаўскім раёне: там за апошнюю пяцідзёнку выехала на работу ўсяго толькі 44 возчыкі, замест намечаных 1.400. Там, дзе праводзіцца масава-палітычная работа, там, дзе сялянам растлумачылі важнасць выканання загатовак лесу для дзяржавы, для соцыялістычнай прамысловасці, там яны працуюць дружна, як, напрыклад, у вёсках Пыры, Стральцы і радзе іншых.

Многія раённыя камітэты партыі і райвыканкомы недаацэньваюць яшчэ як належыць гэтай важнейшай дзяржаўнай задачы, не мабілізуюць для яе ажыццяўлення сельскія советы і працоўных сялян. Яны не звязваюць гэтай работы з падрыхтоўкай да выбараў.

Зусім дрэнна працуе сецьспажывецкай кааперацыі па абслугоўванню патрэб лесарубаў і возчыкаў, што, бясспрэчна, адбіваецца на рабоце.

Партыйныя і совецкія арганізацыі, работнікі лясной сістэмы, профсаюзы павінны ўзяцца за работу і забяспечыць соцыялістычную прамысловасць лесаматэрыяламі, а працоўных—дрывамі. Гэта пытанне вялікай палітычнай і гаспадарчай важнасці.

——«о»——

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР БЕЛАСТОЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 581

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР

тав. ТУРЛЕЙСКАГА ІВАНА АНТОНАВІЧА

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Беластоцкай выбарчай акрузе № 581 выстаўленую агульным сходам рабочых, інжынерна-тэхнічнага персанала і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната г. Беластока, на якім прысутнічала 850 чалавек; агульным сходам рабочых і служачых завода сельгасмашын г. Ломжы, на якім прысутнічала 105 чалавек; агульным сходам інтэлігенцыі г. Ломжы, на якім прысутнічала 500 чалавек; агульным сходам сялян вёскі Пілікі, Бельскага раёна, на якім прысутнічала 179 чалавек, і радам іншых агульных сходаў рабочых, сялян, інтэлігенцыі, чырвонаармейцаў і начсастава, падтрыманую на акруговай прадвыбарчай нарадзе, на якой прысутнічала 253 чалавекі; кандыдатуру тав. Турлейскага Івана Антонавіча, 1913 г. нараджэння, пражываючага ў г. Ломжа, Беластоцкай області, беспартыйнага, тэхнарука завода сельгасмашын г. Ломжы.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР уключыць кандыдатуру тав. Турлейскага Івана Антонавіча ў выбарчы бюлетэнь па Беластоцкай выбарчай акрузе № 581 па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

У адпаведнасці з арт. 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» пастанову надрукаваць да ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей СЯМЁНАЎ,
Намеснік старшыні ШЫШКІН,
Сакратар акруговай камісіі ГІРКО,
Члены камісіі: МАЛЫГІН, ГЕЦЭВІЧ, МАКСІМІЛЮК, ЧЭРНЫШОВА, КАНАНОВІЧ, ЮРОЎЧЫК, ХОМЧЫК.

г. Беласток, 20 лютага 1940 г.

АКРУГОВЫЯ ПРАДВЫБАРЧЫЯ НАРАДЫ

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ 597 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

КАВАЛЁВА МІХАІЛА ПРАКОФ'ЕВІЧА

260 упаўнаважаных, выбраных рабочымі беластоцкіх прадпрыемстваў, чыгуначнікамі і сялянамі Заблудаўскага і Беластоцкага раёнаў, сабраліся ўчора ў доме Чырвонай Арміі на прадвыбарчую нараду.

Прапанова аб выбранні ў ганаровы прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным была сустрэнута громам апладысментаў. З усіх канцоў зала раздаюцца прывітальныя воклічы ў чэсць правадыра народаў таварыша Сталіна, комуністычнай партыі і совецкага ўрада.

Даклад аб чарговых задачах прадвыбарчай кампаніі зрабіў старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Новікаў.

Камбрыг т. Шышэнін у сваім выступленні расказаў упаўнаважаным аб слаўным жыццёвым шляху тав. Кавалёва М. П.

— Тав. Кавалёў, — гаворыць ён, — сваю службу ў радах арміі пачаў з арганізацыі атрада Чырвонай гвардыі, на чале якога ён выступіў на абарону рэволюцыі. На франтах грамадзянскай вайны тав. Кавалёў не раз праяўляў не толькі мужнасць і гераізм, але і таленавітасць палкаводца. Гэта было і пры вывадзе войск з белагвардзейскага акружэння ад Астрахані, і ў абароне чыгуначнай сувязі Астрахані з Масквой, і ў ліквідацыі арміі генералаў Марозава і Улагая, і ў іншых выпадках. У 1922 г. тав. Кавалёў паступіў у Ваенную Акадэмію ім. Фрунзе, якую паспяхова скончыў, пасля чаго паслядоўна назначаўся камандзірам дывізіі, камандзірам корпуса, намеснікам камандуючага Кіеўскай Ваеннай Акругай і камандуючым Беларускай Асобай Ваеннай Акругай.

— Пасля прыходу Чырвонай Арміі, — гаворыць рабочы III тэкстыльнага камбіната тав. Каліноўскі, — да нас на фабрыку прышоў ваенны. Ён сабраў рабочых, пагутарыў з намі, даведаўся аб нашым жыцці і прыняў меры, каб задаволіць нашы просьбы.

Гэта быў Міхаіл Пракоф'евіч Кавалёў, камандуючы Беларускім фронтам.

Ці ёсць на свеце другая такая армія, у якой камандуючы франтам ходзіць не на банкеты, а на фабрыкі да рабочых, каб даведацца аб іх жыцці і патрабаваннях? Няма другой такой арміі.

Вось чаму мы з вялікай радасцю вылучылі тав. Кавалёва кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета і будзем усімі сіламі яго падтрымліваць.

Вылучэнне кандыдатуры тав. Кавалёва М. П. горача падтрымалі таксама рабочы 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Пшэбняк, сялянка Заблудаўскага раёна т. Сіскевіч і інш.

У прынятай рэзалюцыі запісана:

«Акруговая прадвыбарчая нарада цалкам і поўнасцю падтрымлівае кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па Беластоцкай выбарчай акрузе № 597 т. Кавалёва Міхаіла Пракоф'евіча, камандуючага Беларускай Асобай Ваеннай Акругай, тройчы ордэнаносца, члена бюро ЦК КП(б)Б, асабіста кіраваўшага вайсковымі аперацыямі па вызваленню працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў, вылучанага многалікімі калектывамі рабочых і служачых гор. Беластока і беластоцкай області.

Акруговая нарада бярэ на сябе абавязацельства агітаваць за тав. Кавалёва М. П., як за дастойнага кандыдата блока комуністаў і беспартыйных».

З вялікім уздымам сустрэлі ўдзельнікі нарады прапановы аб пасылцы прывітанняў правадыру народаў таварышу Сталіну, главе совецкага ўрада таварышу Молатаву і Наркому Абароны Маршалу СССР таварышу Ворашылаву. Прывітанні прыняты пад гром апладысментаў і буру прывітальных воклічаў.

Для арганізацыі агітацыі за кандыдата, нарада выбрала 12 чалавек даверанных.

Каралькоў.

АКРУГОВАЯ НАРАДА УПАЎНАВАЖАНЫХ 601 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

СЕЎКО ПАЎЛА АНТОНАВІЧА

Валкавыск. (Ад нашага спецкора). 18 лютага ў памяшканні валкавыскага кіно-тэатра адбылася прадвыбарчая нарада прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, таварыстваў працоўных і прадстаўнікоў сялянства. Сабралася 174 чалавекі, уваходзячыя ў 601 выбарчую акругу.

Пасля кароткай прамовы тав. Банцырава пачаліся выступленні. Слова атрымлівае тав. Гукаў. Ён заяўляе:

— Адзіная сям'я гераічнага беларускага народа на працягу 20 год была раз'еднана польскімі панамі. Паднявольны народ Заходняй Беларусі толькі з прыходам доблеснай Чырвонай Арміі ўздыхнуў поўнымі грудзьмі. Дзякуючы вялікай дапамозе брацкага народа Совецкага Саюза і вялікага Сталіна мы, як поўнапраўныя гаспадары свайго жыцця, выбіраем вышэйшы орган улады.

Вось чаму на ўсіх прадвыбарчых сходах працоўныя вылучаюць сваімі першымі кандадатамі таварыша Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя нашай акругі,—працягвае тав. Гукаў,—сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР на прадвыбарчых сходах аднадушна вылучылі тав. Сеўко Паўла Антонавіча. Тав. Сеўко—сын беларускага народа. Вылучаючы кандыдатуру Паўла Антонавіча, выбаршчыкі ведаюць, што ён з чэсцю апраўдае іх давер'е.

Выступаючыя таварышы Залеўскі, Прыкалаў, Табакоў, Талачынскі, Падольскі і інш. у сваіх выступленнях таксама горача падтрымалі кандыдатуру тав. Сеўко.

Старшыня нарады прадастаўляе слова тав. Сеўко. З радасным хваляваннем ён гаворыць:

— Выбаршчыкі нашай акругі аказалі мне вялікую чэсць, вылучыўшы маю кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. У вашай асобе я запэўняю ўсіх выбаршчыкаў, што іх вялікае давер'е я з чэсцю выканаю. Буду дзяржаўным дзеячом ленінска - сталінскага тыпа. За справу працоўнага народа, за росквіт сваёй соцыялістычнай радзімы, не пашкадую ні сваіх сіл, ні здароўя.

У аднагалосна прынятай пастанове нарада просіць тав. Сеўко даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па 601 выбарчай акрузе.

Нарада прыняла зварот да ўсіх выбаршчыкаў акругі, у якой заклікае ў дзень выбараў 24 сакавіка аддаць свае галасы за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за Сеўко Паўла Антонавіча.

Д. Казлоў

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 19 лютага на Карэльскім перашэйку наша наступленне прадаўжала паспяхова развівацца. Нашы часці прадаўжалі ачышчаць ад праціўніка Біоркскі ўмацаваны раён і занялі: востраў Рыон-Саары — за тры кілометры на захад ад горада Юханес, востраў Рэвон-Саары — за пяць кілометраў на паўднёвы захад ад Юханес, станцыю Ляхтонмякі і станцыю Хумол-Іокі Прыморскай чыгункі

На астатніх участках фронта без істотных перамен.

Наша авіяцыя вяла актыўныя баявыя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 14 самалётаў праціўніка.

ОПЕРСВОДКА ШТАБА ЛЕНИГРАДСКОГО ВОЕННОГО ОКРУГА

В течение 20 февраля на Карельском перешейке наше наступление продолжало развиваться. Наши части заняли город и крепость Койвисто (Бьорке) и очистили от противника полуостров Койвисто (Бьорке). Захвачены большие военные трофеи.

На остальных участках фронта не произошло ничего существенного.

Наша авиация вела успешные, активные боевые действия по войскам и военным объектам противника. В происшедших воздушных боях сбито 47 самолетов противника.

На снимке: Заседание окружной избирательной комиссии Пролетарского избирательного округа № 352 г. Белостока по выборам в Верховный Совет БССР. У карты—председатель комиссии Ф. Ф. Галейша. (Фото Сапир).

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР і БССР

СХОДАМ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ГОР. САКОЛКА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Грыбаедаў Нікалай Іванавіч

(***На сходзе прысутнічала 380 чалавек***)

З вялікім уздымам прайшоў сход інтэлігенцыі г. Саколка, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

На сходзе выступіў тав. Першоў, які заявіў, што тав. Грыбаедаў Н. І. — старшыня райвыканкома, будзе дастойным кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад Саколкаўскай выбарчай акругі.

Прапанову тав. Першова горача падтрымалі тав. Понель і іншыя выступаючыя на сходзе.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі сход запісаў:

„Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Саколкаўскай выбарчай акрузе № 374 ад інтэлігенцыі г. Саколкі тав. Грыбаедава Нікалая Іванавіча, беларуса, селяніна, члена ВКП(б) працуючага старшынёй Саколкаўскага РВК, пражываючага ў г. Саколка.

Прасіць тав. Грыбаедава даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Саколкаўскай выбарчай акрузе“.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ Н-СКАЙ ЧАСЦІ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Румянцаў Аляксей Гаўрылавіч

У клуб Н-скай часці прышлі байцы, камандзіры, палітработнікі, члены сямей начсастава, каб вылучыць свайго пасланца ў соцыялістычны парламент ордэнаноснай Беларускай рэспублікі.

На трыбуне палітработнік тав. Шандроў:

— Я прапаную, — гаворыць ён,—вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР дастойнага сына нашай партыі Аляксея Гаўрылавіча Румянцава.

Уступіўшы ў 1920 г. ў партыю, тав. Румянцаў усе свае годы жыцця аддаў народу. Сваю адданасць справе партыі Леніна—Сталіна ён даказаў на франтах грамадзянскай вайны, у перыяд мірнага будаўніцтва нашай вялікай радзімы, у час вызвалення заходніх абласцей Беларусі ад уціску польскай шляхты.

Усе выступаўшыя горача падтрымалі прапанову тав. Шандрова.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі сход запісаў:

„Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 333 Нараўскай выбарчай акрузе ад байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н—скай часці тав. Румянцава Аляксея Гаўрылавіча, 1901 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1920 года.

Прасіць тав. Румянцава даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 333 Нараўскай выбарчай акрузе“.

СХОДАМ ПРАЦОЎНЫХ ГОР. КНЫШЫНА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Чэрнікаў Александр Нікіфаравіч

(***На сходзе прысутнічала 500 чалавек***)

На агульным сходзе працоўных гор. Кнышына, прысвечаным вылучэнню кандыдатаў у Вярхоўны Совет БССР, выступіў тав. Бабоўскі.

— Новае, радаснае жыццё нам прынесла наша асвабадзіцельніца Чырвоная Армія, — гаворыць ён.—Зямлю сялянам дала совецкая ўлада. Для нашых дзяцей шырока адчыніліся дзверы школы. Я прапаную па нашай выбарчай акрузе вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР камандзіра Чырвонай Арміі Чэрнікава Александра Нікіфаравіча.

Удзельнікі схода аднадушна прынялі рашэнне вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Александра Нікіфаравіча Чэрнікава, члена ВКП(б), двойчы ордэнаносца. Працоўныя звярнуліся да тав. Чэрнікава з просьбай даць згоду балатыравацца на Трэцянскай выбарчай акрузе № 360.

СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ САКАЛЯНЫ, САКОЛКАЎСКАГА РАЁНА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Кукліч Вікенцій Вікенцьевіч

(***На сходзе прысутнічала 182 чалавекі***)

Сяляне вёскі Сакаляны, Саколкаўскага раёна, на сваім сходзе аднадушна рашылі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Кукліча Вікенція Вікенцьевіча, 67-гадовага селяніна-бедняка з гэтай-жа вёскі.

Сход рашыў прасіць тав. Кукліча В. В. даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Тэалінскай выбарчай акрузе № 375.

СХОДАМ ПРАЦОЎНЫХ М. ТШЦЯННО ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Каханская Юзэфа Антонаўна

(***На сходзе прысутнічала 200 чалавек***)

Сход працоўных мястэчка Тшцянно, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, прайшоў з вялікім уздымам.

Сход аднадушна рашыў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад працоўных мястэчка Тшцянно тав. Каханскую Юзэфу Антонаўну, польку па нацыянальнасці, батрачку, беспартыйную, і прасіць яе даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета па 361 выбарчай акрузе.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ ПРАЦОЎНЫХ М. ДАМБРОВА ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Дземех Люба Данілаўна

(***На сходзе прысутнічала 360 чалавек***)

Працоўныя м. Дамброва сабраліся на свой прадвыбарчы сход, каб абмеркаваць пытанне аб вылучэнні кандыдата у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Дземех Любу Данілаўну, сялянку з вёскі Острала. Сход звярнуўся да яе з просьбай даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 362.

СХОДАМ РАБОЧЫХ СКУРЗАВОДАЎ № 16 І 17 М. СКІДЭЛЬ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Гайсін Вульф Борухавіч

(***На сходзе прысутнічала 200 чалавек***)

Рабочыя скурзаводаў №№ 16 і 17, радасныя, сабраліся на сход.

Па прапанове рабочых скурзаводаў тт. Банчыка і Кравіца сход аднадушна пастанавіў:

Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 366 выбарчай акрузе ад рабочых скурзаводаў тав. Гайсіна Вульфа Борухавіча, члена КП(б)Б, Народнага Камісара лясной прамысловасці БССР, працаваўшага старшынёй часовага ўпраўлення Беластоцкай вобласці, пражываючага ў гор. Мінску.

Прасіць тав. Гайсіна В. Б. даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 366 выбарчай акрузе.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСАК ГАЛЫНКАЎСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, САПОЦКІНСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Дарошка Феафіла Міхайлаўна

(***На сходзе прысутнічала 300 чалавек***)

На сход сабраліся сяляне Галынкаўскага сельсовета. Слова папрасіў урач Гудзінскі. Ён сказаў:

— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Дарошка Феафілу Міхайлаўну. Яна паходзіць з сялян-беднякоў, была абрана дэпутатам Народнага Сабрання і апраўдала наша давер'е.

Сход у прынятай рэзалюцыі запісаў: „Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Дарошка Феафілу Міхайлаўну і прасіць яе даць сваю згоду балатыравацца па выбарчай акрузе № 364“.

ТЭКСТЫЛЬШЧЫКІ ВІЦЕБСКА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАМ БЕЛАСТОКА

Рабочыя, работніцы, інжынеры, тэхнікі і служачыя віцебскай чулочна-трыкатажнай фабрыкі імені Клары Цэткін звярнуліся з пісьмом да тэкстыльшчыкаў Беластока. У сваім пісьме яны расказваюць аб сваім жыцці, рабоце, аб тым, як яны ўдзельнічалі ў выбарах дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

— Мы працуем і шырока скарыстоўваем свае права на адпачынак, — пішуць рабочыя, — нашы дзеці навучаюцца ў школах, у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Мы прымаем актыўны ўдзел ва ўсім дзяржаўным, гаспадарчым і грамадскім жыцці нашай краіны.

Іосіф Вісарыёнавіч Сталін — наш першы ўсенародны дэпутат. Гэтаму геніяльнаму чалавеку ўвесь наш совецкі народ абавязан вызваленнем навечна ад рабства, прыгнёту і эксплаатацыі, сваім жыццём, поўным радасці і шчасця, сваімі грандыёзнымі гістарычнымі перамогамі.

У Вярхоўны Совет СССР мы выбралі сваімі дэпутатамі былую работніцу ільнопрадзільнай фабрыкі імені Кагановіча тав. Багачову (у сучасны момант нам. дырэктара швейнай фабрыкі „Профінтэрн“) і калгасніка таварыша Власенкова (зараз старшыня Міхалеўскага сельскага Совета дэпутатаў працоўных).

Нашымі народнымі пасланнікамі ў Вярхоўны Совет БССР з'яўляюцца: кіраўнік ленінградскіх большэвікоў, член Палітбюро ЦК ВКП(б), бліжэйшы друг і саратнік вялікага Сталіна тав. Жданаў, сакратар Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі тав. Панамарэнка, былая работніца, цяпер дырэктар буйнейшага чулочна-трыкатажнага гіганта БССР — фабрыкі „КІМ“ тав. Ханіна; у нядаўнім мінулым хатняя работніца, цяпер начальнік ліцейнага цэха станкабудаўнічага завода імені Кірава тав. Немчанка; знатны машыніст, цяпер начальнік Віцебскага паравознага аддзялення тав. Майораў і інш.

У часе выбарчых кампаній калектыў нашай фабрыкі прымаў актыўны ўдзел ва ўсёй агітацыйнай і арганізацыйна тэхнічнай рабоце, агітаваў за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У час выбараў у мясцовыя советы наш калектыў вылучыў са свайго асяроддзя 58 чалавек членамі выбарчых камісій, 12—даверанымі асобамі і 42 чалавекі—агітатарамі і бяседчыкамі.

На ўсіх выбарах, як на выбарах Вярхоўных Советаў СССР і БССР, так і на выбарах мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных перамог сталінскі блок. Увесь свет яшчэ раз убачыў маральна-палітычнае адзінства совецкага народа, яго арганізаванасць, высокую палітычную свядомасць і актыўнасць, гарачую любоў і бязмежную адданасць Совецкаму ўраду, партыі большэвікоў і вялікаму Сталіну.

Дарагія таварышы! Многа год вы цярпелі іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Вы былі бяспраўныя. Вы падвяргаліся гнуснай эксплаатацыі. Вас за людзей не лічылі. Сёння вы свабодныя, роўнапраўныя грамадзяне. Вы па-новаму, паленінску, па-сталінску пачалі будаваць сваё жыццё і вам прадастаўлена вялікая чэсць на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі выбраць сваіх дэпутатаў у Вярхоўныя Советы Саюза ССР і БССР. Прыміце-ж, дарагія таварышы, нашы вам пажаданні.

Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў вылучайце самых лепшых, самых адданых справе партыі Леніна—Сталіна, праверанных на практычнай рабоце людзей, і за іх шырока разгарніце большэвіцкую агітацыю.

Ведайце, што прытаіўшыеся ворагі будуць прабаваць вам напакасціць. Будзьце зоркі і пільны. Яшчэ цясней згуртуйцеся вакол совецкай улады, комуністычнай партыі большэвікоў і вялікага Сталіна.

Не забывайце аб сваёй авангарднай ролі, дапамагайце яшчэ шырэй разгарнуць выбарчую кампанію на сяле, сярод працоўных сялян.

Азнамянуйце выбарчую кампанію высокай палітычнай і вытворчай актыўнасцю, павышэннем прадукцыйнасці працы.

Мы ўпэўнены, што ў знамянальны дзень 24 сакавіка вы ўсе, як адзін, пойдзеце на выбарчыя ўчасткі і аддадзіце свае галасы лепшым сынам і дочкам народа, яшчэ раз прадэманструеце сваю гарачую любоў і бязмежную адданасць любімай радзіме, Совецкаму ўраду, комуністычнай партыі большэвікоў і нашаму дарагому правадыру і настаўніку — вялікаму Сталіну.

В помощь агитатору

Советский депутат—слуга народа

Верховный Совет СССР — высший орган государственной власти Советской страны. Он издает законы, он управляет социалистическим государством рабочих и крестьян.

12 декабря 1937 года состоялись первые выборы в Верховный Совет СССР на основе Сталинской Конституции. Советский народ послал управлять страной лучших сынов и дочерей родины.

В Верховный Совет избрано 1.143 депутата, из них 569 депутатов — в Совет Союза и 574 депутата — в Совет Национальностей. Во всех избирательных округах избранными оказались кандидаты сталинского блока коммунистов и беспартийных.

Кто же избран в Верховный Совет СССР?

Первым депутатом Верховного Совета СССР трудящиеся избрали своего любимого вождя и учителя — товарища Сталина, организатора побед социализма. Советский народ избрал депутатами Верховного Совета вместе с товарищем Сталиным его славных соратников: тт. В. М. Молотова, К. Е. Ворошилова, Л. М. Кагановича, М. И. Калинина, А. А. Андреева, А. И. Микояна, А. А. Жданова, Н. С. Хрущева.

Среди депутатов Верховного Совета СССР 870 членов и кандидатов партии большевиков и 273 беспартийных. Иначе говоря, более $^3/_4$ состава Верховного Совета — члены великой партии Ленина—Сталина, авторитет которой среди народных масс страны непоколебимо высок.

Можно без преувеличения сказать, что в Верховном Совете СССР представлен во всем своем многообразии великий, многонациональный советский народ. В Верховный Совет СССР избраны рабочие и крестьяне - колхозники, работники партийных и советских органов, комсомольских и профсоюзных организаций, бойцы и командиры Красной Армии, советская интеллигенция — учителя, врачи, ученые, артисты. Это лучшие люди страны.

480 депутатов — 42 проц. всего состава Верховного Совета СССР — рабочие; 337 депутатов (29,5 проц.) — крестьяне; 326 депутатов (28,5 проц.) — советская интеллигенция.

Ни в одной буржуазной стране, кичливо называющей себя «демократической», нет и не может быть подлинно народного представительства. В парламентах буржуазных государств дела решают капиталисты, помещики и их приспешники.

Вот примеры.

В английской палате общин заседает 317 землевладельцев, промышленников, банкиров, лиц, живущих на проценты с капиталов, и прочих дельцов, 99 — представителей тредюнионов (профсоюзов) и чиновников аппарата лейбористской партии, услужающей буржуазии.

В Соединенных штатах Америки (США) пролетариат составляет больше 70 проц. всего населения, а крупные капиталисты — менее одной десятой процента. А кто управляет этой страной? Больше половины палаты представителей конгресса (так называется парламент в США) составляют капиталисты, промышленные и финансовые дельцы, адвокаты, стряпчие.

А вспомним бывшую панскую Польшу. В числе 208 депутатов польского сейма не было ни одного рабочего. В сейме верховодили помещики, торговцы, промышленники, офицеры, ксендзы и другие представители эксплуататорских классов.

В нашем советском парламенте—Верховном Совете СССР—почетную и ответственную обязанность депутатов несут подлинные представители народа, вышедшие из его недр, выросшие на советской работе, воспитанные партией Ленина — Сталина.

В Верховном Совете СССР обсуждают важнейшие государственные дела выдающийся артист лучшего в мире театра И. М. Москвин и грузчик Одесского порта Арон Хенкин, президент Академии наук СССР В. Л. Комаров и украинская колхозница Мария Демченко, положившая начало стахановскому движению на свекловичных полях страны. С одинаковым правом решают в нашем парламенте государственные вопросы и маршал Красной Армии и рядовой красноармеец; директор предприятия и токарь; выдающийся ученый и колхозник; летчик, поставивший мировые рекорды, и тракторист; известный писатель и водитель паровозов.

В составе депутатов Верховного Совета СССР — 189 женщин. Женщине в Советском Союзе предоставлены совершенно одинаковые с мужчиной права во всех областях политической, хозяйственной и культурной деятельности. Среди женщин-депутатов: Татьяна Федорова — ударница строительства Московского метрополитена; Евдокия Виноградова — зачинатель стахановского движения в текстильной промышленности; Басти Багирова — знаменитый хлопковод Азербайджана; учительница Ольга Леонова; бывшая домашняя работница из Киева Прасковья Гусятникова; бригадир тракторной бригады белорусская колхозница София Рачек; летчица — Герой Советского Союза Валентина Гризодубова и много других женщин, которыми по праву гордится страна.

В Совете Национальностей СССР интересы наций и национальностей, входящих в Советский Союз, представляют депутаты от всех республик, автономных областей и национальных округов, входящих в СССР. В Совете Национальностей заседают депутаты 59 различных национальностей: русские, украинцы, грузины, узбеки, белоруссы, буряты, евреи, чуваши, молдаване, карелы, татары, представители других народов, братски об'единившихся в многонациональном Советском государстве.

Депутат советского парламента связан с народом тысячью нитей. Он ответственен перед своими избирателями, он регулярно отчитывается перед ними. Депутат держит живую связь с избирателями, встречаясь с ними лично, либо отвечая на их многочисленные письма, запросы, предложения.

Депутат советского парламента — слуга народа.

Нигде в мире нет такой подлинной народной власти, как у нас, в СССР.

Н. ВАСИЛЬЕВ.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТАМ

УТВАРЭННЕ І ГЕРАІЧНАЯ АБАРОНА БЕЛАРУСКАЙ ССР

IV.

(Працяг. Пачатак у № 41).

Маладая Беларуская совецкая рэспубліка прыступіла да аднаўлення гаспадаркі, разбуранай імперыялістычнай вайной і гаспадараннем нямецкіх акупантаў і польскіх легіянераў. Пачалося арганізацыйна-палітычнае будаўніцтва. Умацоўвалася абараназдольнасць Чырвонай Арміі. Цэнтральны Камітэт партыі і асабіста Ленін і Сталін кіравалі будаўніцтвам БССР. На дапамогу пасылаліся сродкі, людзі. Беларускі народ свабодна ўздыхнуў пасля жахаў імперыялістычнай вайны і акупацыі.

Але з захаду пагражаў новы вораг—панская Польшча. Польскія памешчыкі і капіталісты якіх Вялікая соцыялістычная рэвалюцыя пазбавіла велізарных маёнткаў у Беларусі і на Украіне, буйных прадпрыемстваў у Расіі, смяротна ненавідзелі Совецкую краіну. Гэтая нянавісць яшчэ ўсугублялася ростам рэволюцыйнага руху польскіх рабочых і сялян.

Створаная англійскім і французскім урадам з дапамогай Злучаных штатаў Амерыкі, атрымаўшая ад іх Заходнюю Украіну і частку раёнаў з нямецкім насельніцтвам, панская Польшча з'яўлялася паслухмянай зброяй у руках Антанты для барацьбы супроць Краіны советаў.

Польшча, атрымліваўшая ад Антанты грошы, зброю і інструктароў, прымала ўдзел ва ўсіх паходах Антанты супроць Расіі. Толькі за час з лістапада 1918 г. да пачатку 1920 г. Польшча атрымала ад Англіі і Францыі 185 тысяч вінтовак, 5 тыс. кулямётаў, 120 танкаў, 300 гармат, 135 самалётаў.

К вясне 1919 г. Антанта рыхтавала свой першы паход супроць Совецкай краіны. Па плану Антанты Польшча павінна была нанесці ўдар на захадзе.

Совецкі ўрад прапаноўваў Польшчы заключыць мір. Але панская Польшча ў снежні 1918 г. разарвала дыпламатычныя адносіны з Совецкай Расіяй, узброіўшы свае войскі з дапамогай Антанты, рушыла іх да совецкіх граніц.

Першы ўдар панская Польшча нанесла Літоўскай і Беларускай совецкім рэспублікам. У мэтах больш паспяховай барацьбы са знешнім ворагам — Польшчай і імперыялістамі Антанты — і з унутранай контррэволюцыяй, у прыватнасці беларускімі і літоўскімі буржуазнымі нацыяналістамі, вырашана было аб'яднаць Беларускую і Літоўскую рэспубліку ў адну Літоўска-беларускую совецкую соцыялістычную рэспубліку (Літбел).

Я. М. Свердлоў на пасяджэнні Цэнтральнага бюро комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі 2 лютага ўказваў, што матывам утварэння адзінай Літоўска-беларускай рэспублікі з'яўляецца імкненне ЦК абезапасіць гэтыя рэспублікі ад магчымасці праяўлення ў іх нацыянальна-шавіністычных імкненняў.

I Усебеларускі з'езд советаў і I з'езд советаў Літвы пастанавілі аб'яднаць свае сілы для барацьбы супроць знешніх і ўнутраных ворагаў.

I Усебеларускі з'езд советаў выпусціў дэкларацыю аб зліцці Беларускай і Літоўскай совецкіх рэспублік.

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі на чале з Леніным і Сталіным дапамагаў маладым совецкім рэспублікам. Ленін і Сталін сачылі за стварэннем часцей Чырвонай Арміі для барацьбы з палякамі. Я. М. Свердлоў пасылаў людзей у дапамагу большэвікам Беларусі і Літвы, указваў ім на неабходнасць ствараць на месцах часці Чырвонай Арміі — узброеную сілу для барацьбы з польскімі захватчыкамі.

27 лютага аб'яднанае пасяджэнне цэнтральных выканаўчых камітэтаў абодвух совецкіх рэспублік прыняло дэкларацыю аб мірнай палітыцы і звярнулася да Польшчы з прапановаю заключыць мір. 28 лютага на аб'яднаным пасяджэнні быў выбран урад Літоўска-беларускай совецкай соцыялістычнай рэспублікі.

Польскі ўрад адмовіўся весці мірныя перагаворы з урадам Літоўска-беларускай совецкай соцыялістычнай рэспублікі. З пачатку лютага 1919 г. Пілсудскі сканцэнтроўвае войскі на граніцах совецкіх рэспублік і ад асобных сутычак і набегаў на совецкую зямлю пераходзіць да рашучага наступлення на Совецкую Літву і Беларусь.

V.

У ноч на 17 красавіка 1919 г. польскія войскі нечакана нападаюць на Ліду. 18 красавіка яны захватваюць Навагрудак, 19 красавіка — Баранавічы. Гераічна біліся часці Чырвонай Арміі і атрады комуністаў і рабочых, але пад даўленнем перавышаючых сіл праціўніка вымушаны былі адступіць. Палякі пачалі наступленне на Вільну. На працягу трох дзён комуністы, чырвонаармейцы і комсамольскі атрад стойка абаранялі горад, кожную вуліцу, але ў няроўнай барацьбе яны былі разбіты, і 21 красавіка Вільна была захвачана палякамі.

Прыехаўшы ў Вільну, Пілсудскі звярнуўся да насельніцтва з дэмагагічнай адозвай, у якой абяцаў «вольнасць і свабоду» жыхарам захвачаных палякамі абласцей.

Працоўныя Літвы вельмі добра ведаюць цану гэтым абяцанням. У Вільне пачаліся пагромы і шматлікія грабяжы. Некалькі тысяч чалавек у першыя-ж дні былі пасаджаны ў турму, цэлыя эшалоны накіроўваліся ў беластоцкі канцэнтрацыйны лагер і ў іншыя месцы зняволення. Забівалі дзяцей, жанчын, старыкоў. Асабліва бязлітасна распраўляліся палякі з комуністамі.

Польскія войскі наступалі на гарады і сёлы Беларусі, і ўжо к маю стварылася пагроза Мінску.

Войскі панскай Польшчы неслі беларускаму народу прыгнечанне, яны ператваралі беларускія абласці ў сваю калонію. Польскія ўлады аднаўлялі прыватную ўласнасць памешчыкаў і капіталістаў, вярталі ім усю маёмасць, адабраную рэволюцыяй і народам, скасоўвалі советы, зямельныя камітэты, профсаюзы.

Характэрны загад камандзіра 70-га пяхотнага польскага палка Мадлеўскага: ён забараняў на вуліцах Ліды размовы на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах; загад нацкоўваў польскіх салдат на яўрэйскае насельніцтва, як быццам спрадвечных ворагаў палякаў.

Нечуваныя здзекі выпалі на долю працоўных захвачаных палякамі раёнаў. Так, у Пінску было расстраляна 37 чалавек. Арыштаваных падвяргалі жудасным катаванням: раздзявалі дагала, звязвалі рукі і ногі і білі гумавымі палкамі так, каб знакаў не асталося, палілі пяткі папяросамі, збівалі рукаяткай рэвальвера па галаве і зубах, устаўлялі пальцы арыштаваных паміж дзвярмі і ламалі пальцы, зачыняючы дзверы.

Беларуская мова праследвалася, беларускія школы закрываліся. Польскія войскі ўступілі ў Совецкую Беларусь як банды грабежнікаў і забойц. Яны грабілі багацці беларускай зямлі, належаўшыя народу. Яны цэлымі паяздамі вывозілі ў Польшчу лес, хлеб, жывёлу, сала, аўчыны.

Комуністычная партыя падняла на барацьбу супроць наглых захватчыкаў увесь беларускі народ. Быў створан Совет абароны. Партыйныя і комсамольскія арганізацыі праводзілі мабілізацыю сваіх членаў на фронт. Профсаюзы пасылалі туды рабочыя атрады.

Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі Літвы і Беларусі мабілізаваў 50 проц. усіх комуністаў, адправіў для работы на фронт адказных работнікаў, членаў ЦК і ЦВК Літвы і Беларусі.

Агульны сход мінскай партыйнай арганізацыі 27 красавіка вынес пастанову аб мабілізацыі 50 проц. сваіх членаў для неадкладнай адпраўкі на фронт. Астатнія 50 проц. павінны былі праходзіць курс ваеннага абучэння. Мабілізацыя была праведзена на працягу пяці дзён.

Слуцкая арганізацыя дала 130 комуністаў. Бабруйская, барысаўская і ігуменская мабілізавалі 50 проц. свайго састава. Баранавіцкая і віленская арганізацыі мабілізавалі ўсіх комуністаў. У Гомелі быў сфарміраван батальён калькасцю каля 1 тыс. чалавек.

Браслаўская арганізацыя сфарміравала атрад з комуністаў і спачуваючых. У адным з баёў атрад панёс вялікія страты. Для папаўнення атрада браслаўская арганізацыя прыслала астаўшыхся комуністаў. Агульны сход мозырскай арганізацыі пастанавіў мабілізаваць і залічыць у атрад усіх комуністаў. 3-га мая несвіжская арганізацыя мабілізавала ўсіх комуністаў і спачуваючых ва ўзросце да 25 год.

Гераічныя старонкі ў гісторыю барацьбы за Совецкую Беларусь упісала комсамольская моладзь. Уся мінская комсамольская арганізацыя была пераведзена на казарменнае становішча.

Рабочы клас Беларусі дружна падняўся на барацьбу супроць акупантаў. 21 мая на надзвычайным пасяджэнні Совета народных камісараў, ЦВК Літвы і Беларусі, Мінскага совета разам з праўленнямі профсаюзаў і фабзаўкомаў была прынята наступная рэзалюцыя:

«1. Кожны рабочы ад гэтага часу з'яўляецца салдатам рэволюцыі. 2. Кожны, хто не жадае несці зброю, з'яўляецца ворагам народа і павінен служыць яму на цяжкіх тылавых работах. 3. Усе прыпасы харчоў, усе прыпасы адзення і абутку павінны быць адданы арміі. Рабочы клас патрабуе ад усіх і кожнага напружання ўсіх сіл, поўнага спакою, рабочы клас упэўнен, што яго намаганні прывядуць да перамогі». («Звезда» № 443 ад 22 мая 1919 г.).

Мінская агульнагарадская канферэнцыя профсаюзаў і фабзаўкомаў пастанавіла мабілізаваць на фронт усіх рабочых і служачых ва ўзросце ад 20 да 30 год. Прафесіянальныя саюзы і фабрычна-заводскія камітэты стварылі асобы рабочы полк для абароны Мінска: рабочыя абучаліся ваеннай справе без адрыву ад вытворчасці. Не было ні аднаго профсаюза, які не прымаў-бы ўдзелу ў абароне краіны. У Гомелі на агульнагарадской рабочай канферэнцыі аднагалосна была прынята пастанова аб мабілізацыі для неадкладнай адпраўкі на фронт усіх рабочых—членаў профсаюзаў з 19 да 25 год. У Віцебску на ўсіх заводах арганізаваліся баявыя часці; у Рэчыцы—пралетарскі батальён.

Комуністычная партыя Літвы і Беларусі правяла вялікую работу па мабілізацыі працоўнага сялянства. Кожная воласць павінна была вылучыць не менш дваццаці стойкіх, мужных і адданых совецкай уладзе сялян. Сялянства БССР дружна адклікнулася на заклік партыі.

Так, напрыклад, па Пінскаму павету 11 і 18 мая адбыліся ва ўсіх валасцях многалюдныя мітынгі, на якіх грунтоўна раз'яснялася сялянам мэта мабілізацыі. Сяляне валасцей: Загародскай, Добраслаўскай, Лорышскай і іншых—уліліся ў партызанскія атрады і адбівалі напад польскіх банд. Штодзённа прыбывалі ў Лупінец дабраволыцы для накіравання іх у часці Чырвонай Арміі.

У прыфронтавай паласе сяляне па ўласнай ініцыятыве кожную ноч хадзілі ў разведку на старану непрыяцеля пад відам расшуквання сваіх сем'яў, жывёлы і т. д. Увесь народ апалчыўся на ворага.

Падрыхтоўваючы ваенны паход на Совецкую Беларусь і Літву, Пілсудскі прымаў усе меры да таго, каб знутры падарваць совецкія рэспублікі.

Польская дэфензіва і шпіёнская ваенная арганізацыя Пілсудскага арганізуюць шпіёнскія і дыверсанцкія гнёзды, скарыстоўваючы для гэтага польскіх рэзідэнтаў, адразу-ж пасля рэволюцыі ў Расіі накіраваных у совецкія рэспублікі ксяндзоў, якіх было так многа ў касцёлах Беларусі, памешчыцкіх і буржуазных сынкоў.

Калі совецкая ўлада аддала памешчыцкія землі сялянам, нацыяналізавала прадпрыемствы, гэтыя элементы затаіліся па ўтульных кутках, прымазаліся на службу ў совецкія ўстановы і вялі тут сваю шпіёнскую і дыверсанцкую работу. Сярод памешчыкаў і капіталістаў Беларусі было многа палякаў. Яны з'яўляліся таксама знаходкай для польскай дэфензівы.

Агенты польскай дэфензівы прабавалі прабрацца ў кіруючыя ўстановы Літоўска-беларускай рэспублікі, каб у выгадны момант адкрыць фронт ворагу. Ворагі беларускага народа—контррэволюцыйныя беларускія нацыяналісты, эсэры, бундаўцы аб'ядналіся з польскімі шпіёнамі і дыверсантамі. Яны паднімалі кулацкія паўстанні супроць совецкай улады, белагвардзейскія мяцежы ў часцях Чырвонай Арміі.

Заклятыя ворагі беларускага народа віталі напад палякаў на Беларусь і заклікалі панскую Польшчу да далейшага наступлення на Совецкую краіну.

Нацдэмаўская газета «Звон» пісала: «Польшча павінна дапамагчы Беларусі, яна павінна прасунуць свае войскі яшчэ далей на ўсход, каб адабраць у большэвікоў Усходнюю Беларусь». («Звон» № 1 за 1919 год).

У 1919 г., у пачатку польскай акупацыі, у Вільне пры дапамозе польскага ўрада створана была Беларуская рада Віленшчыны і Гродненшчыны: у Мінску быў утворан «Беларускі нацыянальны камітэт», а ў снежні 1919 г. быў сфарміраван марыянетачны ўрад «Беларускай народнай рэспублікі».

Цэнтральная рада Віленшчыны і Гродненшчыны прыняла рэзалюцыю, у якой вітала Пілсудскага. Мінскі камітэт заклікаў «будаваць беларускую дзяржаву ў уніі з Польшчай».

Па ўказцы Пілсудскага нацдэмы пачалі фарміраваць контррэволюцыйныя атрады.

Ужо ў жніўні 1919 г. контррэволюцыйная рада Віленшчыны і Гродненшчыны вылучыла ваенную камісію пры галоўным камандаванні польскай арміі. Войскі беларускіх нацдэмаў уваходзілі як састаўная частка ў польскую акупацыйную армію. За подпісам Пілсудскага ў Мінску быў апублікаван загад аб стварэнні «Беларускай ваеннай камісіі» 13 кастрычніка 1919 года. На чале гэтай «камісіі» былі пастаўлены махровыя контррэволюцыянеры, белабандыты, правакатары і дыверсанты — алексюкі, рак-міхайлоўскія і інш.

Але ўсе спробы ўцягнуць працоўных Беларусі ў гэтае «войска» праваліліся.

Нацдэмам удалося скалаціць толькі банды забойц і пагромшчыкаў Булак-Балаховіча. Свае банды беларускія нацдэмы ўтрымлівалі за кошт субсідый, атрымліваемых імі ад польскай дэфензівы, ад французскай і англійскай буржуазіі.

VI.

З глыбокага падполля большэвікі Беларусі арганізоўвалі масы на барацьбу з польскімі панамі і іх агентурай—беларускімі контррэволюцыйнымі нацдэмамі.

Беларусь пакрылася густой сеткай партызанскіх атрадаў. Яны дзейнічалі ў глыбокім тылу польскіх войск: у Пінскім, Слуцкім, Мінскім, Ігуменскім, Мозырскім, Бабруйскім і іншых раёнах.

Атрады гэтыя дасягалі значных размераў. Напрыклад, атрад Апанаса Паланейчыка з Старых Дарог налічваў да 500 чалавек. Ён еднаў партызанскія атрады вёсак Крынкі, Медовічы, Радуцічы, Пастовічы і Новыя Дарогі. У Рудабельскай воласці ў партызанскім атрадзе было да 200 чалавек. Усе гэтыя атрады былі моцна звязаны з падпольнымі большэвіцкімі арганізацыямі Беларусі, стварыўшымі галоўны штаб партызан.

Партызаны часта вялі сапраўдныя баі супроць польскіх войск: такавыя—бой на рацэ Оле, бой за Рудабелку, дзе партызаны ўпорна біліся супроць польскага атрада ў 1500 салдат з 30 кулямётамі і 3 гарматамі.

У прыфронтавай паласе партызанскія атрады ўстанаўлялі цесную сувязь з часцямі Чырвонай Арміі і ўсяк ім дапамагалі: чырвоныя партызаны разбуралі пуці ў тылу польскіх войск, пускалі пад адкос паязды з воінскімі эшалонамі, адбівалі ў палякаў зброю, грамілі іх камендатуры і нападалі на асобныя атрады. Са зброяй у руках абаранялі партызаны свае родныя вёскі ад карных польскіх атрадаў. Недарма яны ўнушалі смяротны жах польскім панам, бачыўшы у гэтым усенародным руху свой блізкі канец. Азвярэлыя захватчыкі вялі жорсткую барацьбу супроць беларускіх партызан. Захвачаных у палон яны падвяргалі нечуваным здзекам, а затым расстрэльвалі. За сувязь з партызанамі і дапамогу ім яны расстрэльвалі сялян, спальвалі датла цэлыя вёскі.

Прывядзем характэрны загад камандуючага Падляскай арміяй палкоўніка Стржэмінскага, выданы 10 мая ў Пінску: «1. Злоўмышленікі, злоўленыя пры надрэзванні або псаванні тэлеграфных і тэлефонных слупоў, правадоў, а таксама віноўныя ў пашкоджанні якіх-небудзь ліній зносін, падвяргаюцца расстрэлу на месцы злачынства, а іх маёмасць—канфіскацыі. 2. У выпадку, калі віноўнікі злачынства не будуць выяўлены, адказнасці падлягаюць: у горадзе—домаўласнік, перад домам якога пашкоджана лінія або слуп; у полі або ўздоўж чыгункі—жыхары вёсак, якія знаходзяцца па суседству з месцам злачынства, прычым мужчынская частка насельніцтва вёскі ва ўзросце ад 18 да 50 год будзе выстраена ў адну шарэнгу і кожны пяты будзе аддан палявому суду. Маёмасць пакараных смерцю канфіскуецца, звыш таго вёска заплаціць грашовы штраф». (Цэнтральны архіў Кастрычніцкай рэволюцыі. Асобы аддзел, с. № 3 1919).

Але ні карныя атрады, ні зверствы польскіх захватчыкаў не маглі задушыць магутны народны рух. Беларускі народ вёў вялікую айчынную вайну супроць польскіх паноў.

VII.

На дапамогу беларускаму народу прышлі рускія рабочыя і сяляне.

Ленін і Сталін з вялікай увагай сачылі за гераічнай барацьбой беларускага народа супроць польскіх інтэрвентаў. Цэнтральны Камітэт і совецкі ўрад прымалі ўсе меры для дапамогі Беларускай рэспубліцы. Калі летам 1919 г. рабочыя ў гарадах Беларусі галадалі і не хапала харчавання для заходняга фронта, Ленін у тэлеграме ад 3 чэрвеня 1919 г. даў спецыяльныя ўказанні Наркампроду Украіны аб забеспячэнні харчаваннем Беларусі: «Нарады для белітарміі (для беларуска-літоўскай арміі) і наогул Наркампрод літбел (Наркампрод Беларуска-літоўскай рэспублікі) Мінск вельмі прашу не затрымліваць і накіроўваць па назначэнню (у) Мінск, усяляк паскараць...» (Ленінскі зборнік XXIV, стар. 126).

У мэтах умацавання заходняга фронта ЦК аддаў распараджэнне Магілеўскаму губернскаму камітэту партыі прыпыніць адпраўку папаўненняў на ўсходні фронт і правесці мабілізацыю 50 проц. комуністаў на заходні фронт. Аналагічная тэлеграма ЦК РКП(б) была паслана ў чэрвені ў Смаленск.

Совецкі ўрад прымаў меры да аб'яднання сіл усіх совецкіх рэспублік для адпору ворагу.

1 чэрвеня ВЦВК выдаў дэкрэт аб ваенным саюзе совецкіх рэспублік Расіі, Украіны, Літвы, Беларусі і Латвіі для барацьбы з міжнародным імперыялізмам.

Цэнтральны камітэт накіраваў у Беларусь і на заходні фронт віднейшых дзеячоў партыі.

У чэрвені М. І. Калінін з агітпоездам «Октябрьская революция» зрабіў паездку па Беларусі. Ён быў у Мінску, Віцебску, Магілёве, Гомелі, Бабруйску, Оршы і ў іншых месцах. 20 чэрвеня поезд прыбыў у Мінск. М. І. Калінін вітаў сабраўшыхся рабочых і служачых і закончыў сваю прамову заклікам умацоўваць саюз паміж совецкімі рэспублікамі. Ён гаварыў: «Небяспека сусветнай контррэволюцыі, небяспека, пагражаючая нам з боку тых банд, якія стараюцца задушыць совецкія рэспублікі, усё гэта разам узятае, прымушае нас прыкласці ўсе намаганні да таго, каб між намі быў самы цесны саюз, каб існаваў брацкі саюз паміж двума совецкімі рэспублікамі». Вечарам М. І. Калінін выступіў на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літвы і Беларусі, Мінскага совета і профсаюзаў. Ён абяцаў дапамогу рускага народа Совецкай Беларусі: «Расійская Совецкая Рэспубліка паслала вам ваенную дапамогу. Я не сумняваюся, што ва ўсе цяжкія моманты на заходнім фронце Расія будзе вас абараняць. Гэты саюз дасць нам магчымасць перамагчы нашых ворагаў і ўмацаваць уладу абодвух соцыялістычных рэспублік».

Прыбыццё старшыні ВЦВК выклікала рэволюцыйны ўздым і натхняла працоўныя масы Беларусі ў іх барацьбе супроць інтэрвентаў.

(Працяг у наступным нумары).

ЗА РУБЕЖОМ

„ЧИКАГО ДЕЙЛИ-НЬЮС" О ПОЛОЖЕНИИ В ФИНЛЯНДИИ

Нью-Йорк, 20 февраля. (ТАСС). Газета „Чикаго дейли ньюс" сообщает: „В настоящее время совершенно ясно, что советские войска, прорвавшие главную линию обороны Маннергейма, угрожают всей западной половине финского фронта и имеют возможность атаковать Выборг. Финская оборона Карельского перешейка вступила в самую острую стадию, исход которой невозможно предсказать. Советская артиллерия, указывает газета, считается лучшей и более дальнобойной, чем английская".

БАЛГАРСКІ ДРУК АБ ПОСПЕХАХ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Поспехі савецкіх войск у барацьбе з белафінамі знаходзяць у апошнія дні шырокі водгук у балгарскім друку. Газеты падкрэсліваюць несакрушальную сілу савецкай ваеннай тэхнікі і высокае маральнае становішча байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі.

Газета „Утро" піша: „Савецкія войскі добра ўмацаваліся на занятых імі пазіцыях. Маральнае становішча савецкіх войск выдатнае. Пры неспрыяючых умовах яны ваююць дзень і ноч".

Большасць газет падкрэслівае, што становішча белафінаў стала зусім безнадзейным. Газета „Зора" прыводзіць прызнанне Манергейма, заявіўшага амерыканскім карэспандэнтам аб зусім безнадзейным становішчы і вялікіх стратах белафінскіх войск. Учора адна з газет пісала, што дзеянні савецкіх войск з'яўляюцца наглядным урокам для тых, чые арміі не маюць ніякіх дасягненняў на заходнім фронце.

Китайские войска заняли Наньнин

Чунцин, 20 февраля. (ТАСС). Агентство Юнайтед Пресс передает из Чунцина сообщение китайского командования провинции Гуанси, в котором говорится, что между китайскими войсками и колоннами японских войск, прикрывающими отход главных японских сил из Наньнина, происходят бои. Японцы понесли большие потери, в результате которых они вынуждены были оставить город.

Лондон, 20 февраля. (ТАСС). Гонконгский корреспондент агентства Эксчейндж телеграф сообщает, что, по сведениям из китайских источников, китайские войска заняли Наньнин.

АРЕСТЫ ЧЛЕНОВ „ИРЛАНДСКОЙ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ АРМИИ"

Стокгольм, 20 февраля. (ТАСС). Газета „Дагенс нюхетер" сообщает, что в ночь на 18 февраля в Дублине в отеле „Митэ" арестовано 13 членов „ирландской республиканской армии". 6 арестованных принадлежат к руководству „ирландской республиканской армии".

ВОЙНА В ЗАПАДНОЙ ЕВРОПЕ

Париж, 20 февраля. (ТАСС). Агентство Гавас сообщает, что «за последние 3 дня немцы проявляют возрастающую активность». Агентство признает, что вчера ночью в горно-лесном районе, расположенном восточнее реки Нид, был разгромлен французский отряд. Убито около 20 человек.

Воздушных боев не происходило.

В опубликованном вчера вечером в Париже официальном коммюнике говорится, что «к западу от Саара отряд противника пытался приблизиться к одному из наших постов. Он был отброшен с потерями. Через Рейн снова происходила перестрелка».

В сегоднешнем утреннем коммюнике сказано: «Вылазка противника к востоку от реки Нид окончилась неудачей. На остальном фронте наблюдалась слабая активность».

Берлин, 20 февраля. (ТАСС). Верховное командование германской армии сообщает, что «юго-восточнее Бузендорфа на французской территории германский разведывательный отряд уничтожил неприятельский грузовик с 20 человеками.

Германская авиация производила разведывательные полеты над Северным морем».

В Минском пехотном училище деятельно готовятся к празднованию 22-ой годовщины РККА.
На снимке: Ансамбль красноармейской песни и пляски под руководством курсанта И. Г. Мехалькова разучивает новые песни. (Фотохроника БЕЛТА).

НАКАНУНЕ XXII-й ГОДОВЩИНЫ РККА

Смотр красноармейских талантов

18 февраля в Доме Красной Армии Белостокского гарнизона был проведен смотр красноармейской самодеятельности. На этом смотре было показано 40 различных номеров с участием около 300 красноармейцев, командиров, политработников и членов их семей.

К числу лучших номеров, представленных на смотре, жюри отнесло выступление симфонического оркестра молодых бойцов Н-кой части под руководством красноармейца Гордиенко. Оркестр в своем составе насчитывает два кларнета, виолончель, контрабас, две скрипки и трамбон. Он организован недавно, но на смотре замечательно исполнил несколько произведений Чайковского и других композиторов.

На одном аккордеоне отлично играли красноармейцы Белов и Шурыгин. Украшением смотра было соло в исполнении красноармейца Топчиева, который с большим успехом исполнил концертный этюд Листа. Отличную оценку жюри получил кукольный театр, который в постановке красноармейца Бронзас показал спектакль „Кого мы били, бьем и будем бить".

Наиболее полно и широко, по мнению жюри, на смотре была представлена самодеятельность части, где комиссаром тов. Прокофьев. Характерной особенностью коллективов этой части является широкое привлечение к своим выступлениям местного населения.

Решением жюри лучшие коллективы и отдельные исполнители будут премированы деньгами и ценными подарками.

К. Васильев.

Красная Армия в работах художников Белостока

Вскоре после вступления Красной Армии в Белосток в городе была создана оргруппа союза советских художников БССР. Сейчас она объединяет 80 высококвалифицированных мастеров живописи.

Первыми и самыми благодарными темами работы художников были темы о героической Красной Армии, об освобождении трудящихся из-под гнета польских панов. 25 человек заключили договор на изготовление эскизов к произведениям для выставки „Ленин и Сталин — организаторы белорусской государственности".

Сейчас большинство художников уже закончило работу над эскизами. Краевский приготовил эскиз на тему „Арест офицеров полицейских и помещиков". Художник Рольницкий в своих работах отобразил тему „Въезд Красной Армии в Белосток". Трибе—„Встреча Красной Армии с беженцами". К выставке над темами, посвященными Красной Армии, работают также художники Кшечановский, Фридман и др.

Талантливый скульптор Рапапорт закончил эскиз памятника-монумента „Освобождение Западной Белоруссии". Этот памятник будет сооружен в Белостоке.

Гутаркі і даклады прысвечаныя Чырвонай Арміі

Актыўна рыхтуюцца да XXII гадавіны Чырвонай Арміі працоўныя Ломжынскага раёна.

З 10 па 20 лютага на ўсіх прадпрыемствах, выбарчых участках, у вясковых клубах праводзіліся гутаркі і даклады.

Сяляне Драздоўскага і Купійскага сельсаветаў з вялікай увагай і зацікаўленасцю 18 лютага слухалі даклад на тэму: „Ленін і Сталін як арганізатары Чырвонай Арміі".

Ва ўсіх школах горада рыхтуюцца да дня Чырвонай Арміі вялікія вечары мастацкай самадзейнасці

18 лютага ў гарадскім кінотэатры адбыўся сход дапрызыўнікаў горада, у якім прыняла ўдзел больш 400 чалавек.

Сярод рабочай моладзі горада пачата падрыхтоўка да здачы норм на абаронныя значкі.

22 лютага ў гарадскім кінотэатры адбудзецца ўрачысты сход партыйнага, камсамольскага і прафсаюзнага актыва.

М. Шаховіч.

Рыхтуюцца да свята

Працоўныя Скідзельскага раёна дзейна рыхтуюцца да слаўнай XXII гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Ва ўсіх вёсках праведзены гутаркі і даклады аб гераічнай Чырвонай Арміі.

Звыш 100 прапагандыстаў, якія кіруюць гурткамі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона, расказваюць на сваіх занятках аб непераможнай Чырвонай Арміі і яе арганізатарах — таварышах Леніне, Сталіне і Варашылаве. Многія агітатары правялі гутаркі на тэму: „Сталін—правадыр і арганізатар Чырвонай Арміі". Да дня 23 лютага калектывы самадзейнасці рыхтуюць пастаноўкі і выступленні. У скідзельскім клубе драмгуртком рыхтуецца пастаноўка, а харавы гурток вывучае песні аб Чырвонай Арміі, з якімі будзе выступаць у дзень свята.

В. Гарбанеў.

ВСТРЕЧА С ЕВРЕЙСКИМИ ПИСАТЕЛЯМИ

18 февраля в городском театре состоялась встреча приехавшей из Москвы бригады еврейских писателей с трудящимися г. Белостока.

Вечер открыл секретарь Белостокского Горкома КП(б)Б тов. Новиков.

С интересным докладом на тему „Рост еврейской советской литературы" выступил профессор т. Нусинов.

— После долгих мытарств и страданий, — сказал он, — еврейский народ в Советском Союзе обрел свою родину. За период советской власти изменилось лицо еврейского народа: вырос еврейский рабочий класс и создано еврейское колхозное крестьянство.

Еврейские писатели принимают самое горячее участие в жизни Советской страны. Каждое важное политическое событие вызывает у них горячий отклик. Их деятельность оценена партией и правительством. Многие из них, в том числе и некоторые из присутствующих здесь, награждены орденами и медалями Советского Союза.

С пламенной речью выступил поэт орденоносец Перец Маркиш.

— Революция, — сказал т. Маркиш, — смыла с лица еврейского народа всю грязь и муть тысячелетнего гнета. Партия и Советское правительство дали ему возможность расти и развивать свою национальную культуру. Прошло 22 года социалистического строительства и борьбы за перевоспитание еврейского народа. Борьба была тяжелая, но еврейский народ при помощи многонационального Советского Союза вышел из нее победителем.

Затем с чтением своих произведений выступили поэт-орденоносец Квитко, поэт Кушниров, поэт-орденоносец Галкин, прозаик Годынер и поэт Розин.

Выступлением литературного критика орденоносца т. Добрушина закончился этот замечательный вечер.

Бемов

ИЗВЕЩЕНИЕ

22 февраля в 20 час. (по моск. времени) в помещении désинститута. Красноармейская, 63 состоится лекция для агитаторов на тему:

«Учение Ленина—Сталина о социалистическом государстве».
Докладчик тов. Немцов.

Горком КП(б)Б.

Адказны рэдактар
Б. М. Зельманаў

Управление РК Милиции НКВД БССР по Белостокской области об'являет, что на основании постановления СНК СССР № 1261 от 23 августа 1939 года вводится обязательная регистрация в окольцевании почтовых голубей и выдача разрешений на содержание, разведение и ввоз почтовых и иных пород голубей.

Всем руководителям гражданских предприятий, учреждений, организаций и отдельным гражданам содержащим почтовых и иных пород голубей, надлежит с 20 февраля по 1 марта 1940 года явиться в Белостокское областное управление РК Милиции (ул. Красноармейская 65) и зарегистрировать почтовых и иных пород голубей в установленном порядке.

Виновные в нарушении установленных сроков и порядка регистрации и содержания почтовых и иных пород голубей будут привлекаться к ответственности.

ОБЛАСТНОЕ УПРАВЛЕНИЕ РКМ НКВД БССР.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

На основании постановления по гор. Белостоку от 14 февраля 1940 года городской исполнительный комитет постановляет:

1. Обязать под ответственность руководителей учреждений, предприятий и торгующих частных граждан произвести снятие вывесок прежнего образца к 21 февраля 1940 г. и заменить таковые новыми к 1 марта 1940 г.

Организациям, учреждениям и предприятиям изготовить и укрепить вывески по форме союзных наркоматов, частникам, изготовить вывески с голубым фоном и белыми буквами по размеру, указанном в § 2-м постановления, со сроком исполнения к 1-му марта 1940 г.

2. Установить для учреждений, организаций и предприятий стандарт и размер вывесок 60×40 с/м., покраска: синний фон на стекле.

3. Торгующие организации, в ведении которых находятся магазины, представляют эскизы и стандарт вывесок на утверждение городского исполнительного комитета.

4. Установить, как правило. писание вывесок производить на русском и белорусском языках.

5. Для врачей, юристов, художников и других лиц, занимающихся свободной профессией, установить размер вывесок 20×30 с/м., покраска: черный фон на стекле. (Фамильные вывески по существующему образцу).

6. Наблюдение за выполнением настоящего постановления возложить на отдел горкомхоза и органы Милиции.

Настоящее постановление входит в силу после 7 дней со дня его опубликования.

ГОРИСПОЛКОМ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.
Упаўнаважаны абл.літа № 189.
1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.